*Сайт газеты «ВІЦЬБІЧЫ»*
*13.04.2018*
*Аўтар: Віталій СЯНЬКОЎ. Фота Андрэя ЖЫГУРА.*

# 20 і 24 красавіка ў Коласаўскім тэатры прэм'ера – камедыя Лопэ дэ Вега «Дурнічка» ў пастаноўцы Міхася Краснабаева







**І зноў у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа прадбачыцца прэм'ера, якая не можа не заінтрыгаваць. У апошні час поспех новых пастановак коласаўцаў пачынаўся са смелага, часам рызыкоўнага выбару драматургічнага матэрыялу. Што і як будзе ў гэты раз?**

А ў гэты раз мастацкі кіраўнік Коласаўскага тэатра **Міхась Краснабаеў** ставіць камедыю **Лопэ дэ Вега** "Дурнічка". На працягу аднаго сезона гэта ўжо другі зварот рэжысёра, пасля сямейнай драмы **Максіма Горкага** "Апошнія", да сусветнай класікі. Той спектакль меў поспех. А як будзе ўспрымаць глядач стылізацыю пад эпоху позняга Рэнесансу ў Іспаніі?

Міхась Краснабаеў з'яўляецца прыхільнікам псіхалагічнага тэатра. Вось і жанр яго новай пастаноўкі пазначаны як лірычная камедыя: гледачу прапануюцца не проста вясёлыя карцінкі, а гісторыя, якая раскрывае вялікую сілу ўсепераможнага кахання. Такую п'есу сам рэжысёр называе камедыяй сапраўднай – яна дазваляе заняць акцёраў трох пакаленняў, і гэта таксама прыкмета Коласаўскага тэатра за апошні час: таленавітая моладзь, прыгожая знешне і ўнутрана, працуе на сцэне побач с майстрамі сярэдняга і старэйшага ўзросту.

У 1968 годзе коласаўцы ўжо ставілі "Дурнічку". Галоўныя ролі выконвалі **Тамара Шашкіна** і **Ніна Левашова** (Фінея), **Галіна Каралькова** (Ніса), **Уладзімір Куляшоў** (Лаўрэнсьё). Праз паўстагоддзя гэта будзе, безумоўна, другая пастаноўка, для сучаснага гледача. Галоўныя партыі павядуць **Юлія Крашэўская** (Ніса) і **Святлана Сухадолава**




(Фінэя), **Цімур Жусупаў** (Лісэа) і **Арцём Герак** (Лаўрэнсьё). Разам з імі на сцэну выйдуць заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь **Рыгор Шацько** (Актаўё), **Раман Салаўёў** (Дуарда), **Дзмітрый Каваленка** (Феніса), заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь **Віктар Дашкевіч** (Місэна), **Святлана Жукоўская** (Сэлья, служанка Нісы), **Наталля Аладка** (Клара, служанка Фінэі), **Генадзь Гайдук** (Турын, слуга Лісэа), **Юрась Цвірка** (Педра, слуга Лаўрэнсьё), **Уладзіслаў Жураўлёў** (Студэнт), заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь **Вячаслаў Грушоў** (Настаўнік пісьменнасці), **Георгій Лойка** (Настаўнік танцаў), **Ульяна Ацясава** (Вулічная спявачка), **Аляксандр Базук, Яўген Бераснеў, Арцём Блахін, Яўген Лук'янаў і Аляксей Стома** (кабальера).

Міхась Краснабаеў застаецца верным свайму прынцыпу – падбіраць такі матэрыял, які дазваляе раскрыцца немаламу патэнцыялу трупы. Нам абяцаюць касцюміраваную феерыю, насычаную гарачымі танцамі, эмацыйнымі песнямі, экспрэсіўным фламенка (мастак-пастаноўшчык – **Святлана Макаранка**, кампазітар – **Руслан Стаброўскі**, аўтар тэкстаў песень – **Алесь Замкоўскі**, харэаграфія **Дзіяны Юрчанка**).

Прэм'ера адбудзецца 20 і 24 красавіка. А затым віцябчане змогуць убачыць "Дурнічку" толькі падчас "Славянскага базару ў Віцебску".